# НАША НІВА

**Цэна асобнаго нумэру 5 кап.**

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 7 Лютаго 1914 г. № 6


## Не перэбіраюць у способах.

Дзе толькі ёсць іскра жыцьця, там павінна быць і вайна за жыцьцё. Такое права прыроды на ўсей зямлі.

Але каб у вайне захавалося паважаньне ворага, вайна павінна быць чэснай. Такое права вайны устанавілі сабе народы.

На жаль у вайне проці нашага адраджэньня ворагі яго не перэбіраюць у способах.

Найлепей даводзюць гэта апошніе здарэньня у нашым жыцьці.

У № 3 «Н. Н.» друкавалася стацьця «Новая напасць». Напасьцю названы быў там той гоман, які польскіе націоналістычные газэты паднялі с прычыны выкрытых Крысякам пісем украінскага сьвяшчэніка Ганіцкаго да павадыра нямецкіх націоналістоў Тідэмана, у каторых Ганіцкі рабіў праекты, каб прыцягнуць да змаганьня с палякамі беларусоў і літвіноў.

Права ўсіх народоў і справядлівасць людзкая кажэ, што за чужые паступкі ніхто не атказывае. Нават болей: нельга, напрыклад, караць бацьку за сына, брата за брата, суседа за суседа і т. д., а ешчэ менш можна караць народ за паступкі і словы чужога чэлавэка, каторы гаворыць ці пішэ ад імені данаго народу, ні маючы на гэта упаважненьня.

А аднак за пісьмы Ганіцкаго да Тідэмана польскіе націоналісты вінавацяць увесь беларускі рух. Мала таго: пасьля апублікаваньня у „Н. Н.“ заявы дэмократычнай беларускай групы, што з нямецкімі гакатыстамі яна нічога супольнаго ні мае і аб ніякіх стасунках з імі ня ведае, усё ж такі польскіе гакатысты ня кінулі за пісьмы Ганіцкаго паганіць беларускі рух, ды нават хапіло у іх бязчэльнай сьмеласьці пісаць, бытцым павадыры беларускаго руху бралі грошы ад нямецкіх гакатыстоў.

Гэта ўжо ня чэсная вайна, а нягодная напасць, несумленная палітыка.

На чым жэ апіраюцца польскіе гакатысты, кідаючы гэткіе закіды?

Апіраюцца на апублікаваных пісьмах Ганіцкаго да Тідэмана. Што-ж мы знаходзім у тых пісьмах? А вось што.

Ганіцкі, пазнаёміўшыся з нейкім беларусам і меўшы з ім гутарку аб комэрцыйных справах, пісаў аб тых справах да Тідэмана і, як відаць з усяго, хацеў гэтае сваё знаёмства выкарыстаць дзеля сваіх палітычных мэт. Гэтак у пісьме з дня 18 серпня 1910 году Ганіцкі пішэ, бытцым «да яго зверталіся» літвіны і беларусы у справе хаўрусу з гакатыстамі. Але ўжо у другім пісьме (з 29 серпня 1910 г.), пісаным да таго-ж Тідэмана, відаць, што у першым не было праўды: тутака Ганіцкі толькі кажэ, што добра было-бы *прыцягнуць* беларусоў і літвіноў да гакатыстоў, ды пытаецца у Тідэмана, ці варта яму гэтым дзелам займацца? А ў трэцьцім пісьме (з дня 17 верэсьня 1910 г.) дык ужо ясна сказана, што «той з Расеі» маніцца прыехаць у Нямеччыну у сваіх асабістых справах, але Ганіцкі яго да таварыства гакатыстоў (Ostmarkenverein) не пасылае, бо лічыць яго няпэўным: „Людзі с Расеі“—пішэ Ганіцькі — маюць такі асаблівы „дух“, праз каторы, відаць, з гакатыстамі іх нельга звязаць.

С пісем тых можна выснаваць адно: Ганіцкі, каб паказаць прад гакатыстамі сваю сілу, нагаварыў ім аб беларусах і літвінох нет ведама чаго, хаця с сваім знаёмым, с каторым спатыкаўся, як відаць, баяўся аткрыта гаварыць. Адным словам, с пісем Ганіцкаго відаць, што ён толькі *пробавау* зачапіць беларусоў і літвіноў, каб прыцягнуць іх да хаўрусу з гакатыстамі дзеля змаганьня с палякамі.

Змаганьне з работай польскіх націоналістоў, каторые запанавалі ў нашай старонцы і загараджываюць дарогу беларускаму адраджэньню, ёсць і павінна быць: гэта саўсім натуральна. Але справа адраджэньня народу лішне вялікая, лішне чыстая, каб у тым змаганьні дзеля яе трэба было злучацца з расейскімі, нямецкімі, ці іншымі націоналістамі. Ды яно было-б і неразумна, бо націоналізм пануючых націй заўсёды кіруецца да таго, каб панаваць нац слабейшым, каб перэтвараць іх у сабе падобных. Гатак польскіе націоналісты кіруюцца да апалячываньня беларусоў, расейскіе да абрусеньня, нямецкіе заўсёды кіраваліся бы да анямечываньня іх. І дружба з аднымі ці другімі можэ быць куплена толькі за цану нашай ўласнай дэнаціоналізаціі. Дзеля гэтаго націоналісты — ўсё роўна якой націі — заўсёды былі, ёсць і будуць ворагамі праўдзіваго дэмократызму і роўнасьці. Справа-ж адраджэньня нашаго народу звязана неразрыўна з дэмократызмам, і ня можэ быць ніякаго сяброўства паміж намі і націоналістамі тэй ці іншай націі.

Гэтак, не было і німа ніякаго сяброўства паміж дэмократамі беларускімі і гакатыстамі. За палітыку-ж Ганіцкаго мы атказываць ня можэм і ня будзем.

## Родная мова.

Кожны народ гаворыць аб дабрэ і зле сваей мовай, і гэта яго права; бо мова—гэта плод географічных і гістарычных варункоў народу, яго звычаёў і абычаёў.

І болей: мова кожнаго асобнаго народу--гэта сумма перэжываньнёў, сумма душ яго жывых і даўно адыйшоўшых у вечнасць пакаленьнёў.

Родная мова—гэта мільёны жывых клетачак мозгу, унасьледаваных чэлавекам ад папярэдзіўшых яго пакаленьнёў, мільёны перэжываньнёў красы, дабра і зла, згукоў і форм; нешчысьлённае багацьця душы, каторае аткрываецца толькі пад дотыкам тых самых згукоў, каторые нарадзілі іх калісь у душах далёкіх пакаленьнёў.

Родная мова—гэта музыка душы, каторай Навышні Стварыцель адарыў чэлавека, гэта натуральны фундамэнт на каторым чэлавек павінен будаваць дом сваей сілы духоўнай, свайго розуму, пачуцьця дабра і эла, справядлівасьці і крыўды, красы і брыдзі.

І горэ таму, хто паднімае руку проці законоў напісаных у кнізе Жывата, рукою Стварыцеля.

Падобен ён да таго неразумнаго чэлавека, каторы будуе дом свой на пяску: спадзе дождж і пацякуць воды і зрыюць яго будоўлю.

Будуйця дом сваей мудрасьці, палацы душы сваей на скале, каторай ёсць родная мова.

Душа, бяз роднай мовы, гэта кветка без каранёў, — гэта разбітая скрыпка, пусты дом напоўнены трупамі.

Душа Жывога не павінна быць гробам пабеляным, каторы панадзен з верху, а ў сярэдзіне повен гнілі; але павінна быць домам радасьці, у каторым грае музыка напевоў калысных вашых матэк і бабак і жыве сіла дзядоў і прашчуроў.

Родная мова чаруе душу і душа рвецца да яе, бо яна калыска душы, гордасць і імя народу.

Сыны Народу павінны любіць і шанаваць яе, бо адна яна жывая крыніца нашаго розуму, пачуцьцёў і семя душы нашай, яна чароўны лек і аружжэ проці сьмерці.

Толькі яе чароўная музыка мае сілу будзіць душы памерших нашых дзяцоў, і аткрываць перэд намі безканечнасць перэжываньнёў тых, каторые радзілі нас і адыйшлі у вечнасць.

Іх душы жывуць у мільёнах нашых мазгавых клетак, у фібрах душы і ажываюць толькі пад гудзьбу згукоў родае мовы.

Родная мова наша, для нас, гэта музыка ўсіх пачуцьцёў, якіе перэжываў народ наш: яго болесьцей і радасьцей, голас яго сэрца і сьвятло яго розуму.

Але якжэ аткрыецца перэд намі наша сэзамская скарбніца, калі ключ да яе, наша мова, або папсован, або загублен намі?

Якжэ мы дабудзем укрытые ў душы нашай скарбы, каторые сабіралі і акуплялі цаной жыцьця і жыцьцёвай практыкі нашы бацькі? Як дабудзем тые нешчысьлёные багацьця мысьлі, паэзіі і перэжываньнёў бацькоў нашых, калі мы забыліся, або сказілі слова, што выклікае іх?

І як мы выкажэм аздобнасць душы нашай, і скуль возьмем аружжэ і сілу у змаганьні за жыцьцё народу, калі чароўная скрыпка, мова наша, папсована?

Мала, Сыном Народу, прызнаваць права на жыцьцё національнай душы—мовы.

Гэтаго не адмовяць нам і чужынцы.

Ад вас, Сыны Народу, вымагаецца болей: вы павінны быць лепшымі! вы павінны будзіць душу сваю і шукаць ключа да нешчысьлёных скарбоў, бо вы правые насьледнікі бацькоў вашых, а не байструкі і падкідышы.

Вы павінны вучыцца роднай мовы, старацца разумець усе адцені чароўнай яе музыкі, павінны ачышчаць яе ад злога зельля, каторае пасеяў на ніве нашай, благі чэлавек, калі работнікі, патомленые днеўнай працай, спалі у ночы.

Кожны беларус павінен, болей чым іншые народы, старацца ачышчаць родную мову ад чужых слоў і зваротоў, бо найміты цемры шукаюць душы нашай, каб забіць яе і затручаюць атрутай крыніцы, скуль пье душа наша.

Запраўды, хто перэсыпае родную мову сваю чужымі славамі—не мае права казаць, што ён любіць яе.

А хто не знае роднай мовы, ня годзен называцца Сынам Народу.

**Юры Верэшчака.**

## Ці запрауды мы ніколі ня будзем мець свайго Міцкевіча, Пушкіна, Сенкевіча, Толстого?

У № 5-ым «Н. Н.» п. Аргус пішэ,—што здарылося яму нідаўна гаварыць з адным „беларусам-інтэлігентам“. Гэты „сын Беларусі» прызнае права Беларусі на національнае адраджэньня і мала таго, ён гатоў ахвотна працаваць для свайго народу, ды яму здаецца, што нічога з гэтаго ня будзе, што якбы Беларусь не развівалася культурна, яна ніколі не даждэцца сваіх Міцкевічоў і іншых. У канцы п. Аргус просіць памагчы радай, якбы „ўдыхнуць сілу у слабое сэрцэ гэтаго нявернаго Хомы“.

Мне здаецца, што „няверны Хома“ так гаворыць ня толькі дзеля таго, што мае слабое сэрцэ, а хутчэй дзеля таго, што крывіць душой. Пан Аргус заве гэтаго „сына Беларусі“ інтэлігентам, а мне здаецца, што гэта збытак для такіх паноў. Гэткіх паноў у нас сягоньня многа. Усе яны абецаюць, што памагалібы, ды баяцца працы свае лажыць дарэмна, бо ў будучым ні бачуць карысьці гэтай працы.

Яны-б хацелі бачыць прад сабой Міцкевічоў!

Стыкаючыся з імі я б спытаў іх, ці яны разумеюць, якое значэньне мае паэт у жыцьці народу? Ці яны цямяць тое, што паэт—гэта кветка выросшая на добрай зямлі? Пекна яна красуецца падняўшы ў верх стройную галоўку сваю! Кветка гэта тым пякнейша, тым дзіўнейша, што у ёй, як у люстры, адбіваецца склад частак глебы, каторая яе выжывіла. Ды ці знайдзеця кветку бяз глебы? Пакажэця мне паэта без народу?

А цяпер, далей, пытаюся «паноў—інтэлігентоў» таго калібру, ці вы разумееця тое, што наш народ ня ёсць ешчэ цяпер гэтаю глебаю, ён цяпер навіна, і, што мы самы павінны старацца, каб яго на гэту глебу вырабіць? Калі вы самі гэтаго не бачыця, дык трэба вам сказаць, што гэты народ нідаўна ўстаў са сну даўгога. Ды што я кажу, ўстаў! Калі вы маеця сэрцэ добрае, калі вы прызнае

цё яму права да развіцця, то старайцесяж разбудзіць яго да жыцьця праўдзіваго, бо ён устаў далёка ня ўвесь.

А хто-ж можэ заручыцца, што у гэтай массе ешчэ спячаго народу не знайходзяцца тые сытные часткі, каторые могуць выкарміць кветку—паэта? Беларусы—гэта народ, так як іншые вялікіе народы, і дайця яму змогу спазнаць гэта, а ён хутка выставіць сваіх паэтаў на раўне с паэтамі іншых народоў.

Я гэта магу цьвярдзіць сьмела, бо кінуўшы вокам на агульнае развіцьце народоў, я ніколі не бачыў, каб народ жыў — падымаўся і разцвітаў без паэта. Заўсёды былі людзі геніальные каторые умелі сабраць характво свайго народу і перэказаць яго у сваіх творах. Чамуж у беларусоў мело-бы быць іначэй, як у усіх людзей. Хай такіе «паны — інтэлігэнты» глянуць з добраго боку на нашу справу сягоньня. Гэтаж так нідаўна мы пачалі праціраць вочы ад сну, а ўжо хваліцца можэм Янкам Купалам, Якубам Коласам і іншымі. Чытайця „паны—інтэлігенты“ іхніе творы, і вы там спазнаеця горкую долю свайго брата, вы спазнаеця, што гэты брат крычыць помачы—ратунку, паглядаючы у ваш бок.

Тамака вы спазнаеця ешчэ і тое, што вы заплюшчыўшы вочы, заткнуўшы вушы на крык і мукі яго, уцекаеця ад яго дзе змога, ды мала таго, вы і тое спазнаеця, што вы самы паднімаеця руку на братоў сваіх, заступаючы ім дарогу да волі і долі.

Хай толькі кожны зробіць для свайго народу гэтулькі, скольк і зможэ і народ гэты хутка падымецца на ногі. Як сытная глеба кветку, так народ наш выгадуе нам паэтаў такіх, як Міцкевіч і Пушкін, а мо і лепшых. Паэты гэтые апісываючы характво, апісываючы падняцьця яго з нядолі выскажуць глыбокую пашану і падзяку ад імені гэтаго народу для тых, што далі яму долю.

**Я. Л.**

## З нашаго жыцьця.

**Хатніе парадкі.**

Жыцьцё нашэ так ідзе, што яно не дастаўляе нам шчасьця і радасці. Іншы нарэкае на Бога, другі на сваю долю, а трэці сам не знае на што. Адзін вучоны чэлавек казаў, што кожны каваль свайму шчасьцю. Я думаю, што гэта праўда. Нам німа што нарэкаці на Бога а трэба пашукаці прычыну нашай нядолі у чом другом. Перш наперш нашэ нешчасце крыецца у нашай цемнаце і нашай баспечнасьці; усе жджом ад Бога папраўунку нашаго жыцьця. «Калі Бог не дасць шчасьця, то чэлавек нічога не парадзіць“, гаворыць наш беларус. Загляніця толькі ў яго хату, ў яго душу, прыглянцеся да яго сямейнаго жыцьця і вы, дарагі чытачу, скажэця, што так жывуць дзікуны. Гаспадыня — цэнтр сямейнаго жыцьця, кіраўнік парадку, строю, ладу, спакойнасьці, любові, пашаны. А ці яна такая? Яна неахайна, ўсё цела яе, асабліва рукі, гразные. У хаці непарадак: лавы, стол, услон, тоўстым слоем гразі пакрыты; хата тры дні часта густа ня мецена, нямытые гаршчкі, міскі, ложкі на лаві цэлы дзень стаяць; адзежа—гандаракі, спадніцы, радюжкі не прыбраны на лавах валяюцца. Дзеці чорные, замурзаные, абарваные. Сама яна цэлы дзень сварыцца з мужыком, дзяцьмі, праклінае іх; мужык не раз яе бье, ды яна не перэстае лаяцца, бо так рабіла яе матка. Ад такой маткі выходзяць сварлівые дзеці і як вырастуць, то робяцца зьвермі, не уважаюць ні бацьку, ні мацеры, ні суседоў, ані старшых бо яны без ўсякаго стыда і павагі. Глядзіш, вышлі сельскіе хуліганы. Што на гэта маці гэтых дзяцей скажэ? Адна ў яе отказка; „Пан Бог пакараў за якіесь грахі“. Я не магу здзівавацца, што малые дзеці 7—8 лет заражэны злом зладзейства, ашуканства, лганё, ня ўбойства ўжо увайшло у іх душу і трудна іх перэрабіць г. зн. перэўспітаць. Заложэнные у іх сэрцы благіе прывычкі, наклоннасьці разрастаюцца і выходзіць чэлавек благі. Жыцьцё быстра цячэ і робіцца ўсё трудней і трудней, і каб палепшыць яго, конешне трэба над ўсім задумывацца, учыцца. Цяпер я скажу пра селякоў, як яны жывуць, каратаюць свой век. Загляніця на яго надворак ў яго клуню і вы, мой дарагі чытачу, не ўбачыця таго, што называецца культурным палепшэнем. Гдзе ня кінь вокам, ўсюды беднота. Сам гаспадар у абарванай сермязі, замузаны, і яда яго—картоплі с постам і чорны хлеб. На мяса, ён кажэ, ў яго німа грошы, на манапольку-ж ён не шкадуе астатняго рубля. У вольны час, калі ў яго німа работы сядзіць у жыда ў карчме і пляце, сам не знае што, або ў карты грае. Так праводзіць наш селянін сваё жыцьцё. Ен жджэ, штобы Пан Бог яму ўсё даваў. Святкаваць ён любіць, для чаго напрыдумлаў многа сьвят.

Што ж трэба зрабіць, каб наш беларус жыў разумна? На гэта ёсьціка адзін адказ Яму трэба асьветы, навукі, каб ён знаў, хто ён такі.

**Стары дзед Міхась.**

### Наша недбайшчына.

У Пецярбурзі, як чуваць ёсць гурток навуковаго пазнаньня Беларусі каля катораго, здаецца, гуртуецца унівэрсытэцкая маладзеж, ды ешчэ ёсць выдавецкая суполка „Загляне сонцэ і у нашэ ваконцэ“. Дзьве беларускіе установы. А тымчасам калі на калядные сьвяты у Пецярбурзе быў зьезд вучыцелёў пачатковых школ, то пецярбурскіе беларусы не сцікавілі зрабіць агульнай вечарынкі дзеля беларускіх вучыцелёў, на каторай можна было-б вытлумачыць найважнейшые пытаньня прасьветы свае забытае бацькоўшчыны. Была самая найлепшая дзеля гэтаго пара, але нашы пецярбуржцы спудлавалі. Нічога цяпер ня зробіш: што прайшло таго ня вернеш. Але каб гэты промах навучыў нас у другі раз быць руплівейшымі і цікавейшымі да справы пашырэньня сваіх ідэй.

Годзі, браткі, спаць, пара прачыхацца і ісці на работу. Цемра народная просіць сонца, просіць сьвету!..

Член з'езду **К. Л—ко.**

### Днепр.

Льецца ціха ды магуча
Днепро, рэчка наша,
То ў сабе галубіць сонцэ,
То паводкай страшэ.

Ой люблю цябе, мой дзедка,
Днепро ты мой родны;
Ў твае воды пазірае
Годны і нягодны.

Сядзе старэц над абрывам,
Грэе свае косьці,
А яму ты пасабляеш
Сьніць аб маладосьці.

Цяжкі гэты сон заўсёды—
Гора было многа,
Ну, а радасьці бывае
Больш у маладога.

Выйдзе к табе ночкай цёмнай
Пара закахана;
Праваркуюць, як галубкі,
Да самога рана,

Ты зірнеш і усьміхнешся
Зашуміш вадою,—
Напужаеш парабочка
З дзеўкай маладою!

На тваю касу пешчану
Летам і вясною
Выбегаюць дзеткі нашы
Пагуляць с табою.

А ты, грозны і магучы,
Як родная матка
Сцеражэш і забаўляеш
Малое дзіцятка.

Я твaей вадой абмыўся
Як на сьвет радзіўся,

## Дзьве раны.

Чаго, ты, шуміш так, бяроза? Ці ты шуміш аб сваім жыцьці, у каторым так многа ты перэнесла ўселякай цяжбы? Цябе ніхто не садзіў, ты сама ўзрасла пры дарозі. Ніхто цябе не паліваў, акром цёплаго веснавога дожджыку. Зямельку каля тваіх карэньнёў падрушывалі толькі чэрвячкі і другіе жывые стварэньня, што так хутка вылазуць з зямлі вясной. Як ты была саўсім ешчэ кволенькая, цябе ні раз занасіло мяцеліцай. Ні адзін раз ты перэтрымала і вялікіе буры. Знесла ты ўсю нягоду злую у сваім жыцьці.

Ці ты, можэ, так жаласна шуміш затое, што скончылося лета, і ты ня будзеш болі маніць сваімі сьвежымі зялёнымі лісьцямі дарагіх гасьцей — пташачэк, каторые так радасна хвалюць Тварыцеля у сваіх песьнях? Ці, можэ, затое, што пад тваей ценьню ня будзіць атдыхаць пасьля цяжкай працы араты?

Не шумі, бяроза! Прыдзе другая весна, абагрэе цябе яснае сонейка, і ты прыбярэшся ў зялёные лісточкі, заместа гэтых, што круцяцца ад ветру каля цябе. К табе прыляціць і сядзе шэрая зязюля, яна звонка закукуіць аб шчасьці і долі... К табе ціха, крадучыся, як цень, прыдзе маладая дзяўчына і будзе ждаць свайго мілаго.

А бяроза усё шуміць і шуміць пахіляючы сваю голую вярхоўку то ў адзін то ў другі бок. Чаго-ж яна шуміць? Яна шуміць і ў гэтым шуме чуецца нейкі плач ад болю, бо з яе белаго цела нехта безжаласнай рукой садраў бяросту і там вялікая рана . Яна чуе, што вясны ужо для яе болі ня будзе .. Яна засохне .. І тады яе сьсякуць. Ешчэ горш зашумела бяроза.

Аб чым, ты, гаруеш, дзяўчына? Чаму, ты, спусьціла свае ясные вочы? За што ты стала бела, як бяроза? Ці табе абрыдла з маленства твая горкая доля у тваім жыцьці? Ты радзілася і ўзгадавалася у вялікім горы. Ня чула ты у люльцы матчыных ласкавых песень, не бачыла ласкі і як расла. У цябе не было цёплаго кутка свайго, ты хадзіла па чужых людзёх, знасіла многа многа крыўды на сваім сэрцы і многа перэнесла цяжкай работы на сваіх маладых плечах. Але усё-ж ты той ціжар здалела ўжо, і цяпер прышлі і твае лепшые дзяньк і, то чамуж табе не засьмеяцца, дзяўчынка?! Паглядзі, як сонейка грэе! Скора весна. Ты выйдзеш на квяцісты зялёны лужок і голасна запяеш песьню

І чуюцца словы дзяўчыны, як той шум бярозы. „Для мяне ня будзе ўжо болей вясны... У мяне на сэрцы глубокая рана. Нікому не загаіць гэтай балючай раны... Загаіў бы яе толькі адзін, каго я і дагэтуль так шчыра кахаю, але ён мяне ўжо пакінуў... І цяпер я адна, як тая бяроза пры дарозі.

Ешчэ горш заплакала дзяўчына ..

**Птушка з балота.**

## Дайця мне прыязнь людзкую!..

Ночка. Заснуло ўжо ўселякае стварэньне... заснуло.. Нават вецярок дуронік, заснуў ціха і соладка... Усё сьпіць .. І птушкі паснулі, не чуваць іх гоману і песень І ўвакол такая цішына... цішына нічым не перэрываная.. вечная..

. . . . . . . . .

На ясным небі мігацяць мільёны зорак... Ночка ўжо глыбокая, а яны ешчэ не сьпяць .. не сьпяць. міргаюць адна на адну і ціха гамонюць паміж сабою... Кожную мінутку ад другой грамады зорак адлучаецца адна.. І сплывае памаленьку, астаўляючы на небі шлях чырвоны падае на зямлю і гіне у абнімаючай яе цемнаце..

. . , . . . . . .

Над вялікай, спакойнай вадою возера, з распушчэнымі валасамі тонкіх, зялёных галінак, аблітая белым, роўным сьветам месяца, стаіць бярозка... Стаіць сонная .. задуманая... А прытуліўшыся да яе стаіць маладая дзяўчына... Яе белы твар пакрыты імглою смутку... З вялікіх, глыбокіх, як морэ, вачэй, пазірае жуда за чымсь незнаным, а жаданым .. Вачыма гэтымі глядзіць яна у мігцячые на небі зоркі... Бо яна—такая сумная, адзінокая—мае да гэтых зорак просьбу... Вялікую просьбу!..

Калісь, даўно, будучы маленькім дзіцяткай, чула яна ад сваей старай няні, што ў летнюю ночку, калі ўсенько пасьне сном глыбокім, а адны толькі зоркі не сьпяць, гамоняць паміж сабою і міргаюць адна на адну,—то яны тады ў цішы нямой раяць аб долі людзкой. І пасылаюць свае сяэтронкі на цёмную нудную зямельку, каб яны пакрыўджэным утулялі сьлёзы нядолі... каб спаўнялі іх найгарачэйшые жаданьня... А калі у тую пару, як зорка падае з неба на зямлю, сумны чэлавек вымовіць свае гарачае жаданьне, то збудзецца яно, збудзецца напэўна.

Словы гэтые успамінала дзяўчына... Успомніла... Словы гэтые сталі перад ею выпісаные агністымі літэрамі на небі .. І бледны яе твар і сумные вочы яе заясьнелі сьветам надзеі... Выцягіваючы рукі да падаючых кожную мінуту зорак ціха, горача шэптаць пачала... «Зоркі мае .. зоркі... прашу вас... прашу аднаго... дайця мне скарб вялікі... скарб, без катораго ніводзін чэлавек шчасьлівым быць ня можэ... без катораго душа чэлавека вечна сумная.. вечна адзінокая... дайця мне яго .. Дайця мне скарб гэны—прыязнь людзкую! . Дайця мне прыязнь людзкую... зоркі! .»

Змоўкла... Толькі у вачах яе шырока атрытых, у сьлёзах вялікіх, цякучых па бледным твару, можна было вычытаць нямую, але гарачую просьбу аб прыязьні людзкой...

. . . . . . . . .

Ночка. Ціха, так ціха . І дрэўца не ўскалыхнецца . і пташка не чырыкне... З яснаго неба падаюць зоркі.. падаюць .. Падаюць ціха... і гінуць ..

**Мірко.**

**Пад суд за маніфэст.**

Украінскі біржэвы камітэт, які звярнуў увагу правіцельства на тое што трэба выпоўніць маніфэст 17 акцябра, цягнуць пад суд.

**Справа і спраўкі адміністрацыі.**

= У Одэсе аддалі пад суд за вымагацельствы шэсць агентаў сыскнога аддзелу.

= У Екаперынаслаўскім сыскным аддзелі увольнілі начальніка аддзелу і яго памошніка за вымаганьне грошэй у прыватных асоб.

= На Падолі, быўшаго начальніка вінніцкай турмы Вершковскаго і некольki турэмных надзірацелёў аддана пад суд за катаваньне арыштованных. Цікава, што п. Вершковскій і цяпер пануе у турме, але ўжо ў іншым мейсцы.

= У Пецярбурзе арыштавалі быўшаго сьледаваценя, каторы папоўніў больш як 20 зладзействаў.

= Есць чуткі, што вядомы ротмістр Трэшчэнко, каторы у свяім часе разстрэліваў ленскіх рабочых маніцца высьвенціцца у свяшчэннікі.

= Харкоўскі губэрнатар вымагае ад горада звялічэньня паліціі так, каб на 400 жыхароў прыходзіўся адзін гарадавік.

= У Яраслаўшчыне земскі начальнік А. варочаючыся с палевання зайшоў у сяло Токарэва і пачаў хадзіць ад хаты да хаты просючыся на члег, але заходзіў толькі ў тые хаты дзе былі адны бабы. Кабеты канечна п. земскаго не пусцілі к сабе на нач, а адсылалі туды, дзе ёсць мужчыны. Посьле нейкаго часу п. земскі засудзіў за гэта усіх баб па 2 — 3 дні арэшту без замены штрафам.

**Забастоўкі і галадоўкі.**

= У Пецярбурзе забаставала гасударсцьвенная друкарня. Пакінулі работу 600 чэлавек. Забаставалі с тэй прычыны, што майстар І. Нэйман за вельмі востра сватаўся да дзеўчат-работніц

= У кастрамской духоўнай сэмінарыі абьявілі галадоўку 340 сэмінарыстоў праз тое, што памоцнік інспэктара за лішне срога з імі абходзіўся.

**За учыцельскі зьезд.**

= У Кіеве дырэкрары народных школ на нарадзе ухвалілі уволіць усіх дэлегатаў на учыцельскі зьезд.

= Александроўская земская управа (у Екацерынаслаўшчыне) увольніла учыцеля што выступаў на вучыцельскім зьездзі у абарону украінскай школы.

**Проці сьвяткаваньня столетняй гадаўшчыны Шэвчэнкі.**

Пецярбурская агентура разаслала ведамасць, што святкаваньня шэўчэнскай гадаўшчыны у лютым г. г. ня будуць пазволены.

**Юбілейные маркі.**

Юбілейные маркі (с партрэтамі расейскіх цароў) будуць ў хаду дя 31 дзекабря 1914 г.

**Ураджай.**

Па данным цэнтральнаго управленьня статыстычнаго камітэту, у 75 губэніях і абласьцях, па атрыманых да 24 студня ведамасьцях, відна, што на ураджай надзея не вялікая.

## У мутным віры.

**Гультай.**

—«Не хачу я болей
Жыць у роднай хаці,
Лепш у сьвет пайду я
Шчасьця пашукаці.
Згіні гэта хата!
Як у ёй нягодна;
Хачу жыць багата,
Сыта і выгодна.
Не хачу я болей
Хлеб з мякінай есці,
Валачыць бравэрку,
Лапці з лыкоў плесці.
Тут усё нескладна
Ні у чым патолі;
Шмат рабіці трэба,
А гульні—ніколі!»
Так казаў сын бацьку,
З дому рваўся ў людзі..
Я б спытаў: дзе-ж лепей
Гэтакаму будзе?..

**Л. Ростоўскі.**

Рэдактар-выдавец
А. Ўласоў.


# БІОМАЛЬЦ З ЖАЛЕЗАМ

## ДЛЯ КРЭПКА МАЛАКРОУНЫХ

мучаючыхся бледнай немаччу, знебыткаваных, слабасільных, рахітычных і слабых з роду дзяцей. Біомальц прадукт дабытый натуральна з соладу. «Біомальц з жалезам» уплывае безпасярэдна на кроў, аздараўляе яе. атхіляе застоі, устанаўлівае акуратную яе цыркуляцію і павялічывае числo крывяных куляк. Пасьля прыняцьця 1—2 бляшанак Біомальца наступае відочнае палепшэньне у агульным палажэньні арганізму, паднімаецца апэтыт, устанаўліваецца акуратнае перэтраўліваньне, нэрвы крэпнуць і настраеньне палепшаецца. Лёгк'е пад ўплывам Біомальца здаравеюць і дыханьня робіцца нормальным і лёгкім. Біомальц прыятны смакам і яго ахвотна прыймаюць нават самые капрысные і хворые дзеці. Ен пажыўнейшы і смачнейшы чым какао.

Біомальц з жалезам: у бляшанках па 1 р. і 1 руб. 80 кап.

Хімічная фабрыка Бр. Патэрман, Тэльтов Бэрлін. Літэратуру высылае прэдстаўніцтво для Расеі Т-во „Аутосіл“, Вільня і Бэрлін.







Толькі **БЕЛАРУСАМ** селянам прадающца вучасткі зямлі у іменьні Гай, каля самаго гораду Пінска Задатак па 20 руб. ад дзесяціны разсрочка платы на колькі гадоў па 6%. Асабліва важна для гароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.

**Э. Зуземіль, ім Гай, каля гор. Пінска Мінск. губ.).**

# БЯЗСПОРНА,

што **„СЭН РАФАЭЛЬ“** ёсць тонічнае, укрэпяючае, устанаўляваючае сілы, памагаючае травіць і вычурнае на смак **ВІНО.** Вымагайця толькі віно Кампаніі віна «Сэн-Рафаэль» **ВАЛАНС,** Дром (Францыя).

**Асьцерэгайцеся падробак.**



**200,000 р. 75,000 р. 40,000, 25,000 р. і т. д**

Праўдзівые Гасударственные **Выгрышные Білеты**

2-ай пазычкі **на 1 марца 1914 году з укладам**

## 7 руб. 50 кап.

прадае Банкірскі дом **М. С. Матусовскій Кіеў** Александроўская вуліца 34.

Асобы даўшые задатку 7 р. 50 кап. атрымліваюць адну двадцатую часць выйгранаго якое можэ пасьці 1 марца 1914 году на двадцаць пяць выгрышных 1-й пазычкі, нумэры каторых акуратна азначэны у квітанціі, высыланнай зара па атрыманьню грошы.

На выпадак ціражу, безплатна абменіваем на квітанцію у 25 білетоў чароднай пазычкі г. зн. 1 марца 1914.

**1 марца 1914 году**

**выігрываюць усяго 300 білетоў 600.000 руб. Выйгрышы адбываюцца ў С.Пецярбурскай Канторы Гасударственнаго Банка**

і табліцы друкуюцца ва усіх газэтах.

**Увага:** Пры высылцы грошы просім: паказаць Ваш акуратны адрэс для заказных пісем.

Спісак асоб, каторые выйгралі па нашых квітанціях вялікіе суммы у Студні, Марцу і Маю 1913 г. і ў Студні 1914 г., высылаюцца, на жаданьне безплатна.

**2 квітанціі на учасьце ў 50 білет. 15 р.**

**3 квіт. на учасьце ў 75 біл. 22 р. 50 к.**

Квітанція высылаецца такжэ і наложэнай платай, па аттрыманьню задатку па 3 руб. на кожную квітанцію.

# Фосфорытны завод
# ІВАНА ВАСІЛЬЕВА

**Ст. Сешчынская Р. О. жал. д.**

## суліць на ўдабрэньня палеў, сенажацеў, садоў і гарадоў

фосфорытную муку з глауканітных фосфорытоў, маючую у сабе ад 12 да 16% фасфорнай кіслаты і да 30% калі.

**Тэрмосфат з абпаленых фос форытоу маючый у сабе ад 18 да 23% фосфорн. кісл. 75% распушчаемасці. Прэйс-куранты рады і отзывы безплатна.**

# У маёнтку Вялікіе Гранічы

## Віленскаго пав. Віленскай губ.

Дзедзіча Свіды, прадающца 400 дзесяцін зямлі, парэзаные на хутарскіе вучасткі рознай меры, у кожным ёсць сенажаць і лясочак. 7 верст ад ст Уша Л. Р. ж. д. Аб варунках можна даведацца па адрэсу: *Горад Радашковічы, Віленскай губ., м. Вялікіе Гранічы, Стэфану Свіда.*

**ДАСТУПНА КОЖНАМУ** купіць вучастак зямлі у „Звярынцы“ у самай лепшай часьці гораду Вільні. Мейсцо васць прыгожая, здровая лео і рэка.

Цэны і варункі выгодные.

С куцляй пасьпешайця: зямлі асталося саўсім мала! Гэта—апошні раз напамінаецца.

За спраўкамі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня „Звярынец“, Георгіеўскіпраспэкт, д. № 48. Тэл. № 46.

**Спраўкі выдаюцца праз увесь дзень, не вылучаючы і сьвят.**


Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.